# Час і прыярытэты

**Дзень народнага адзінства – свята новае, а падзеі, якая яму папярэднічала, ужо больш за 80 гадоў. І сёння досыць складана, асабліва моладзі, сфармуляваць уласнае стаўленне да яго, тым больш, што пакуль няма ніякіх традыцый і абрадаў, а гістарычнае абгрунтаванне за даўнасцю часу, ёсць такія факты, некаторыя імкнуцца абясцэніць.**



Гістарычныя ж падзеі асабіста я ўспрымаю праз прызму літаратуры, праз творчасць пісьменнікаў і паэтаў. Хто што б не гаварыў, не пераказваў успаміны прадзедаў, пра «цудоўнае» жыццё пры панах, падзел Беларусі на Заходнюю і Усходнюю часткі, паводле мірнага Рыжскага дагавора, быў яшчэ адным нялёгкім выпрабаваннем для беларускага народа. На тым баку ад мяжы засталіся родныя і блізкія, сябры і знаёмыя. Як жа горка было, напрыклад, беларускаму класіку Якубу Коласу ад таго, што ён не змог правесці ў апошні шлях сваю маці, якой не стала ў 1929 годзе, бо паехаць на пахаванне ў Заходнюю Беларусь паэту было проста немагчыма. А колькі такіх жыццяў, лёсаў прайшло праз гісторыю «разадранай» на часткі Беларусі?!

Усё гэта скончылася ў 1939 годзе, калі «магутная Чырвоная Армія перайшла граніцу і ў некалькі дзён вызваліла Заходнюю Беларусь, несучы ёй доўгачаканае збавенне і волю, – пісаў Колас. – Не было канца радасці беларускага народа. З якою шчырасцю, з якім захапленнем сустракаў ён сваіх братоў, воінаў Чырвонай Арміі! Гэта былі незабыўныя дні, гэта было шчаслівае адраджэнне народа, які амаль дваццаць гадоў жыў у цяжкай панскай няволі».

Адразу пасля аб'яднання ў горадзе над Пінай пабудавалі новыя сацыяльна значныя аб'екты. Быў рэстаўрыраваны Дняпроўска-Бугскі канал, з'явіліся новыя карпусы суднабудаўнічага завода, свае дзверы расчынілі абласная і гарадская бібліятэкі, абласны тэатр, Дом піянераў і школьнікаў. У студзені 1940-га ў Пінску стаў працаваць аўтобусны парк, праз месяц створана Пінскае педагагічнае вучылішча. Было, канешне, складана пераадольваць штучныя бар'еры, якія ўкараняліся на нашых тэрыторыях амаль чвэрць стагоддзя, але ўсё ж, як кажуць, дома і сцены дапамагаюць. Факт жа ўз'яднання беларускага народа, нягледзячы на сваю значнасць і спрадвызначальнасць лёсу цэлай краіны, на жаль, застаўся выключна на паліцах гісторыі і ў творчасці таленавітых песняроў, ды яшчэ ў назвах беларускіх вуліц – 17 Верасня – у гонар афіцыйнага пачатку нацыянальна-вызваленчага паходу ў Заходнюю Беларусь.

Але аднойчы ўсё-такі гэтую падзею адзначылі па-сапраўднаму, з асаблівым размахам і святочнымі гуляннямі. Адбылося гэта ў 1940 годзе. Пасля свае карэктывы ў жыццё нашай краіны на доўгія гады ўнесла вайна. Нездарма сёння Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка называе Дзень народнага адзінства, які адзначаецца 17 верасня, актам гістарычнай справядлівасці ў адносінах да беларускага народа. Вядома, час ідзе, змяняюцца прыярытэты. Чытайце нашых класікаў, беларускіх песняроў – у іх творах можна знайсці адказы на многія пытанні. Якія б межы не раздзялялі сягоння беларусаў – сапраўдныя ці выдуманыя, намаляваныя ўяўленнем, хочацца, каб кожны, дзе б ён ні быў, шанаваў дзяржаўныя сімвалы, бо шлях да іх быў вельмі складаны і цярністы.

**Ганна КАЛОДЗІЧ,**
**дырэктар-рэдактар газеты**
**«Пінскі веснік»**